View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Васіль СТАРЫЧОНАК

# “НІТКА ЧАСУ ЛЁС ПРАДЗЕ”: МЕТАФАРЫ ТЭМПАРАЛЬНАГА ХАРАКТАРУ

У метафары знайшла сваё выразнае выяўленне філасофская катэгорыя часу, якая адлюстроўвае працягласць існавання ўсіх з'яў рэчаіснасці, паслядоўнасць змен іх станаў. Метафары-кросны, прабіўшыся праз тоўшчу часу і расквітнеўшы на “далонях вякоў”, ткуць “мярэжу тысячагоддзяў”, злучаючы ў адзінае цэлае ніці сённяшняга, учарашняга і заўтрашяга дня.

Характар і асаблівасці метафар часавага тыпу залежаць ад таго, які аспект шырокай тэмпаральнай палітры актуалізуецца ў працэсе метафарызацыі. Сам час і эпоха, калі жыў чалавек, знаходзіць рознае выяўленне ў творах мастацкай літаратуры. Таму само слова *час* ужываецца ў самых нетрадыцыйных і нечаканых кантэкставых сітуацыях і акружэннях (*воўну часу, жорны часу, нітка часу, затокі часу, градабой. часу, абалонь часу, нож часу, крыгі часу, бераг часу, шалі часу, грэбень часу).*

У мастацкай літаратуры час, як правіла, характарызуецца анімістычнай накіраванасцю, адлюстраваннем пэўных перыядаў жыцця чалавека. (звычайна, дзён, гадоў), якія суадносяцца з *пялёсткамі, лісцікамі, з плытамі, вёрстамі, выраямі, вёснамі, летамі.* Рознае бачанне пэўных перыядаў і эпох, іх індывідуальнае ўспрыняцце і аўтарская інтэрпрэтацыя назіраюцца ў метафарызаваных кантэкстах з апорнымі часавымі кампанентамі *дзень, год, век, стагоддзе, эпоха, тысячагоддзе.:*

Тэмпаральныя метафары выражаюць рух і развіццё як універсальныя характарыстыкі асноў быцця. Пры гэтым развіццё характарызуецца пэўным парадкам, паслядоўнасцю і накіравана ад мінулага да будучага. У гэтым няспынным і зменлівым руху вылучаюцца некалькі часавых цыклаў, звязаных звязаных з пачаткам развіцця, пэўным парадкам і паслядоўнасцю станаў (змен) і, нарэшце, завершанасцю існавання: *раніца жыцця, золак стагоддзя, атожылак кахання, арбіта лета, экватар дзён, п’едэстал год, папялішча надзей, дым мінулага, сетка пражытых гадоў, пергамент дзён, далягляд вякоў.*

**Абалонь часу.** *Ах, як іх [гады/] сіла злая шкуматала, рвучы жывога* ***часу абалонь.*** (М. Дукса)

**Агрызкі мінулага.** *Дашчэнту змецены **мінулага агрызкі**.* (М. Чарот)

**Арбіта** ‘пік, вяршыня якой-небудзь пары года’. *Дасяваюць на **арбіце лета** Пухкія планеты дзьмухаўцоў.* (В. Зуёнак) *Узлятае на арбіту лістапад. Парашуцікамі апускаюцца на зямлю лісцікі.* (У. Ліпскі)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Атожылак** ‘зародак, пачатак праяўлення пачуцця’. *Усё гэта няпраўда і выдуманая ёй байка: каханне, яе каханне да яго, хоць і кволае, здранцвелае, а ўсё ж спрабуе даць атожылкі, каб выжыць.* (У. Клімовіч)

**Бездань стагоддзяў.** *Лепш нырну я ў* ***бездань стагоддзяў****, Калі прашчур мой будучы скальдам Шаткаваў крыжакоў пад Грунвальдам.* (М. Танк)

**Вал часу.** *Хтось пад гару ідзе, дзе зоркі, кагосьці з той жа самай горкі, бы зліжа, змые* ***часу вал...*** (Р. Баравікова)

**Валаконцы гадоў.** *Паткаліся густа* ***гадоў валаконцы...*** (У. Паўлаў)

**Верацяно гадоў.** *Пытанні ўе і ўе, няўцямныя па часе,* ***гадоў верацяно****.* (Р. Барадулін)

**Вогнішча гадоў.** *Сыноўняя дарога, Якая пачалася ля парога, Губляецца у* ***вогнішчы гадоў****.* (А. Сербантовіч)

**Воўна часу**. *І прала роспач* ***воўну часу****, счасаную на ваўначосцы гняўлівасці ды неціхоцця. І ткала роспач коўдру часу.* (Р. Барадулін)

**Вывадак дзён.** ***Дзён*** *разгубленых* ***вывадак*** *Твар абдыхвае пысамі.* (В. Стрыжак)

**Вырай** ‘год жыцця чалавека’. *Сорак выраяў сэрца спазнала, а прытулак знайшло назаўжды на гары, дзе не чутна вакзалаў — чуцен подых дняпроўскай вады.* (В. Ярац)

**Вярста** ‘пэўны перыяд (часцей год) чалавечага жыцця’. *Я вёрстаў адтупаў многа — ажно пяцьдзесят чатыры.* (С. Давідовіч) *Незаўважна мы старэем самі У палоне шумных гарадоў. І гудуць бяссоннымі начамі Вёрсты закалыханых гадоў.* (Х. Чэрня) *І абрынецца гнеў Гасподні ля апошняй тваёй вярсты.* (Р. Барадулін)

**Вясна** ‘год чалавечага жыцця’. *Дзень добры, шчасце гулкае, Дзе сорак вёсен звонкіх, сорак год!* (К. Кірэенка) *Адлятаюць мае вёсны, асыпаюць пялёсткі, а я не заўважаю.* (В. Вярба) *Трыццаць вёснаў за спіной, А ці ўсе спакойныя?* (Я. Янішчыц) *Прывяду цябе за вёску, у бярэзнік малады, у свае былыя вёсны, у далёкія гады.* (К. Камейша)

**Вятры эпохі (стагоддзя).** *На скразных* ***вятрах эпохі*** *Я не пасынкам жыву.* (А. Пісьмянкоў) *Гудуць* ***стагоддзя*** *новага* ***вятры****, І на мільён праблем няма адказу.* (З. Марозаў)

**Галкі дзён.** *Прашумелі* ***галкі дзён*** *юначых — болей стала ў сэрцы цішыні.* (В. Гардзей)

**Градабой часу** ‘цяжкія жыццёвыя выпрабаванні’. *Прыму сустрэчна ветру хвалі, крутога* ***часу градабой****.* (В. Вярба)

**Груд гадоў**. *Я рада, што праз* ***груд гадоў*** *Не развучылася смяяцца.* (Я. Янішчыц)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Грунт стагоддзяў.** *З **грунту стагоддзяў** халоднае века Некалі мы прыадчынім яшчэ.* (К. Камейша)

**Грыва гадоў**. *Развітальныя ветры ўчапіліся ў **грыву** хутканогім **гадам**.* (У. Паўлаў) *Любоў мая, ты скрыпка, і цымбалы, І шаргункі — над **грывамі гадоў**.* (Я. Янішчыц)

**Грым гадоў.** *Загаворыць Паўлюк Багрым, І — **гадоў** асыпаецца **грым**.* (С. Гаўрусёў)

**Грэбень часу.** *Як мала... **Часу** жорсткі **грэбень** прычэсвае узбітыя віхры.* (А. Емяльянаў)

**Далоні вякоў.** *Не астыць беларускаму сэрцу На каменных **далонях вякоў!*** (А. Жамойцін)

**Досвітак** 'першае праяўленне, пачатак якога-небудзь часу, перыяду, эпохі'. *Радзіма ў рамане — шырокае абагульненне і разам з тым — зусім канкрэтнае паняцце, раскрытае праз успаміны дзяцінства і першага досвітку юнацтва.* (У. Юрэвіч) *Артыкул У. Казбярука "На досвітку Адраджэння" прысвечаны пісьменніку, дзеячу культуры, этнографу, публіцысту, перакладчыку Аляксандру Ельскаму.* (В. Старычонак)

**Дым мінулага.** *Мы на шырокім жыццёвым паўстанку, Нас не аслепіць **мінулага дым!*** (П. Трус)

**Жорны**. *Час падлічвае рахункі, мелюць **часу жорны**.* (Н. Мацяш) *Жыцця ўсё менш У гулкіх **жорнах часу**, І дні пясчынкамі ссыпаюцца на дно.* (С. Сяргей) *Я з табою ўсё перавякую, Што нам ні намелюць **жорны дзён**.* (Н. Мацяш) *Круцілі ў дзве рукі **стагоддзяў жорны.*** (В. Макарэвіч) *Як зварухнуць мне **гісторыі жорны**? — Як на драбнейшае сіл не стане.* (С. Сокалаў-Воюш)

**Затокі часу.** Былое, мінулае. *З гадоў былых, з цвілых **затокаў часу** ледзь-ледзь жывыя выплываем мы...* (А. Каско)

**Званы гадоў.** *Гудуць, гудуць удзень і уначы **Званы гадоў.** Над вамі. Нада мной.* (Г. Каржанеўская)

**Злом** 'канец, завяршэнне чаго-небудзь'. *Асядаў на зломе дня за вёскай Жніўнем далягляд іржыста-колкі.* (В. Зуёнак) *Колас тварыў на зломе гістарычных эпох.* (І.Навуменка) *І на сумежнасці гадоў, а мо ў жыцця на самым зломе, душу гнятуць былых снягоў і чысціня, і пакрыёмасць.* (А. Каско)

**Золак** 'першае праяўленне, прымета якога-небудзь часу, перыяду'. *Наступіў доўгачаканы няветлівы золак Новага года.* (А. Александровіч) *На золаку XX стагоддзя, калі Расію ўскалыхнулі хвалі першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, на Беларусі цвёрда і ўпэўнена, паэтычна натхнёна загучаў голас Цёткі.* (В. Старычонак) *Каму жыццё блінуў ледзь золак, А мне ўжо вечаровы дым.* (П. Броўка)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Іржа гадоў.** *Насустрач песням-снам туга мая расце. Ірвуся праз **іржу гадоў** ланцужназвонкіх*. (В. Таўлай)

**Каламуць часу**. *Прыслухайся Праз **часу каламуць**, Як за сталом гамонка ўпарта тчэцца.* (В. Макарэвіч)

**Карусель гадоў.** *Ад панядзелка да панядзелка Розных памераў — яны [гадзіннікі] пакрысе З году ў год на разважлівы стрэлках Круцяць бясконцых **гадоў карусель.*** **(**А. Сербантовіч)

**Кілім дзён**. *І зразумееш раптам, **дзён кілім** паспешлівасцю вечнаю прашыты.* (А. Емяльянаў)

**Клін гадоў.** *Дні і ночы мінаюць. **Клін гадоў** нада мной*. (В. Гардзей)

**Кросны вёсен.** *Ані зыку. Толькі ў лёгкіх кронах **Кросны вёсен** сціشана рыпяць*. (Я. Янішчыц)

**Крыгі часу.** *Яго сэрца **крыгі часу** не сатруць.* (М. Танк)

**Лакаматыў гадоў.** ***Лакаматыў гадоў** маіх стракатых Вязе мяне на станцыю надзей.* (Т. Ляшонак)

**Лісцё гадоў.** *І чалавек датуль, пакуль жыве, упарта сам сябе перарабляе, **лісцё гадоў** зграбае аграблямі.* (Р. Барадулін) *Скавыш няўмольнасці саскубвае **лісцё гадоў**.* (Р. Барадулін)

**Лямец дзён.** *Разглядваеш паныла **лямец дзён**,..змарнаваных на тло бясконцых вымаганняў быту*. (Н. Мацяш)

**Мярэжа тысячагоддзяў.** *У памяці свае правы на час, Яна не ведае ні мер, ні межаў І рамантуе рваную **мярэжу Тысячагоддзяў** — толькі дзеля нас*. (Т. Бондар)

**Накат гадоў.** *Памяць чалавечая снарадам Разбівае ўшчэнт **накат гадоў***. (С. Законнікаў)

**Нітка часу.** ***Нітка часу** лёс прадзе, не зважаючы на Бога.* (А. Масарэнка) *Маё сэрца яшчэ не астыла... Покуль нітку жыццё дапрадзе, ашых дзён бурапенная сіла Не дае яму стыць, халадзець.* (Я. Золак)

**Нож часу.** *Атожылак — я, што надзея трымае: Ад вёскі **нож часу** адрэзаў мяне.* (А. Камароўскі)

**П’едэстал год** ‘вышыня, вопыт ад пражытых гадоў’. *І з **п’едэстала** пасівелых **год** у маладосць глядзіш бездапаможна.* (С. Давідовіч)

**Палазы гадоў.** *Гады рыпяць. **Палазы гадоў** не спяць. Да бацькоўскага парога птушкі памяці ляцяць*. (Н. Загорская)

**Памінкі** ‘канец, завяршэнне пэўнай пары года, каляндарнага месяца’. *Па жніўню справіўшы памінкі, Запрэгшы раніцы вазок, Махае верасень галінкай На “лета бабіна” знарок.* (В. Гарановіч) *Сёння восень прыйшла. На памінкі вясны*. (У. Гайдук)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Папялішча** ‘тое, што прайшло, адбылося’. *Я не хачу, каб стаў ты [дом]* ***папялішчам*** *Маіх* ***надзей****, маіх* ***усмешак*** *і* ***пяшчот****.* (К. Камейша) *На* ***папялішчы кахання*** *знікнуць былыя мары.* (І. Хадарэнка) *Стаю адзін над* ***папялішчам*** *Не мною спаленых* ***надзей****.* (В. Стрыжак) *Той* ***гамонкі папялішча*** *На стале яшчэ дыміць.* (К. Камейша) *На* ***папялішчы*** *забітых* ***мараў*** *дарэмна ладзіць сваё гняздо.* (Л. Пранчак)

**Паром сталасці.** *Змоўк ракетны гром, Згубіўся ў хмарах белых, А* ***сталасці паром*** *Другі чакае бераг.* (Р. Барадулін

**Перавяслы год.** *Колюцца з калосся аржанога* ***Перавяслы*** *прашумелых* ***год****.* (У. Паўлаў)

**Пергамент дзён.** Былое. *Змарнаваных* ***дзён пергамент*** *жаўцее ў крылах ветрака.* (Р. Барадулін)

**Плыты жыцця**. *Гады —* ***плыты Жыцця*** *ракі У крыгаход і навальніцу.* (В. Гарановіч)

**Поўсць часу**. *На ім [тэлефоне] сівая* ***часу поўсць****, А ні хвіліны не маўчыць.* (М. Лужанін)

**Прадвесне** ‘пачатак чаго-небудзь’. *Дваццаты век займаўся над Расіяй Прадвеснем грозным будучых баёў.* (А. Звонак) *Прадвесне дваццатага года, юнацтва трывожныя дні.* (М. Хведаровіч) *Недзе на прадвесні сорак трэцяга года пачалася блакада.* (Я. Лецка) *Там радасці кожнай прадвесне, Там кожная сцежка знаёма, Званчэй мая родная песня.* (М. Губернатараў) *Недзе з лесу прыплыў першы подых свежасці, прадвесня світання.* (П. Пестрак)

**Прадзіва дзён.** ***Дзён*** *сівое* ***прадзіва*** *Ніткаю суроваю На сцяжыну прадзеда Памяць выкіроўвае.* (Р. Барадулін)

**Прадонне часу.** *Але ў* ***прадонні часу*** *знікла ўсё.* (В. Зуёнак)

**Прас вякоў.** *Ні усмешак, ні плачу, ні слоў. Толькі вецер над сценамі вые. Сцены гэтыя — лёсы людскія, Спрасаваныя* ***прасам вякоў.*** (Л. Дайнека)

**Прысак.** *На* ***прыску дня*** *аднойчы пабрыду, Пад* ***прыскам дня*** *вугольчыкі знайду.* (Г. Самойлава) *Развеяны зорны* ***прысак Перажытага*** *і* ***дарэмнага****.* (В. Вярба) *Вядзе цябе лёс — Далёка да* ***Вечнасці прыску****.* (Я. Хвалей)

**Прыцемак вякоў** . *Ізноў няўтульнасць у прыродзе У шэрым* ***прыцемку вякоў****.* (І. Гаравая)

**Пялёстак** ‘пэўны перыяд жыцця чалавека (звычайна, дзень)’. *Дні мае — пялёсткі пажоўклыя.* (С. Дзяргай) *Даўно апалі белыя пялёсткі Маёй студэнцкай першае вясны.* (У. Верамейчык)

**Раздарожжа вякоў.** *Грымотных* ***вякоў раздарожжа****, Мяжа небыцця і быцця... З нас кожны часовы прахожы На дрогкай дарозе жыцця.* (З. Марозаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Ранак** ‘пачатак чаго-небудзь’. *Так, гэта быў ранак паэта, усмешліва-ясны, светлы досвітак яго паэзіі.* (М. Арочка) *У кожнага ў жыцці свой ранак, Калі мы ўпершыню змаглі Праз халадок раллі ўзаранай Адчуць цяпло сваёй зямлі.* (У. Гетманчук)

**Раніца** ‘пачатак чаго-небудзь’. *Я даўно ўжо раніцу праехаў, Астравы свае адсмуткаваў.* (Б. Давідзюк) *У сваіх першых вершах Адам Бабарэка вітаў раніцу новага жыцця.* (У. Конан) *Жыцця светлага ты раніца!* (Я. Колас)

**Рошчына** ‘пачынанне чаго-небудзь’. *Колькі, кажучы спрошчана, Стаўлена рошчыны, Колькі страчана пошукаў, Зроблена прочыркаў.* (М. Лужанін) *Маладыя! Зайздрошчу вам, Вы страчаеце золак, З беларускае рошчыны Вашы думкі і голас.* (М. Лужанін)

**Ружанец гадоў**. *Да скону дзён благаслаўляць гатоў Сустрэчу на шматлюднай магістралі, Калі мы ў памяці перабіралі* ***Ружанец*** *школьных сонечных* ***гадоў****.* (У. Скарынкін) *Хоць* ***гадоў ружанцы*** *перабраны, Азірнуся здзіўлена назад.* (Ю. Голуб)

**Саставы веку.** ***Веку*** *мчацца* ***саставы*** *па крутой каляі.* (В. Гардзей)

**Сетка гадоў.** *Праз густую* ***сетку*** *пражытых* ***гадоў*** *дзіцячая памяць выразна захавала той час, калі мы жылі яшчэ ў нашай старой хаце.* (М. Хведаровіч)

**Сіта вечнасці**. *Маўчыш і маўчыш. І ўздыхаеш смялей. О першае слова! Нібыта Хвіліны праз* ***вечнасці сіта*** *Прасейваюцца памалей.* (Х. Чэрня

**Скарынка гадоў.** *А час грызе, грызе* ***гадоў скарынку*** *— І мізарнее з кожным днём запас.* (В. Зуёнак)

**Снягі гадоў**. *Так сэрца, падуладнае табе,* ***Снягі гадоў*** *ніколі не змарозяць.* (У. Лісіцын)

**Стужка стагоддзя.** *Імчыцца вар’яцкая* ***стужка стагоддзя*** *І нас у самотныя хвалі нясе.* (І. Пракаповіч)

**Сувой дзён.** *Танчэе* ***дзён*** *маіх* ***сувой****, Адмеран шлях вышэйшай меркай.* (А. Пісьмянкоў) *А* ***дзён*** *маіх змяншаецца* ***сувой****, ды чым іх менш, тым больш мой дух клапотны.* (А. Лойка)

**Сцяна даўнасці.** *Знікаюць халодныя цені, адсоўваецца ўдалячынь суровая* ***сцяна даўнасці.*** (Р. Мурашка)

**Табун гадоў.** *Праляцеў* ***гадоў табун****, Па душы працюкаў.* (В. Стрыжак)

**Тайм** ‘год навучання ў школе’. *Скончыў Мікола шосты клас, вясёлы прыйшоў на работу. Віншуў, маўляў, брыгадзір, — адзін тайм выстаяў.* (В. Мыслівец)

**Тлен часу.** *Як злы праклён праз пяць кален, Праз небыццё, праз* ***часу тлен****, — Гарыць на скронях сівізна Ва ўсіх адна: вайна.* (В. Зуёнак)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Топка гадоў.** *Вясёлыя, светлыя словы згараюць у* ***топцы гадоў.*** (В. Гардзей)

**Тоўшча часу.** *Люблю грамы/ — журбу дарог сваіх. Праз* ***тоўшчу часу*** *спеўна чую ў іх Дакор матулі на яе парозе.* (В. Ракаў) *Браты мае — байцы і камандзіра, — Праз* ***тоўшчу год*** *я чую вашу кроў.* (С. Гаўрусёў)

**Цягнік гадоў.** *Прайшоў* ***цягнік гадоў.*** (В. Жуковіч) ***Цягнік гадоў*** *у тунель забыцця, Як трус у пашчу ўдава, нырае.* (Р. Барадулін) *Аж шыбамі вызвоньваюць яны [вокны], Калі грыміць* ***гадоў цягнік*** *таварны.* (К. Камейша) *Спыні зялёных* ***год*** *маіх* ***цягнік****, Хацеў бы я ў маленстве прыпыніцца.* (У. Лісіцын)

**Час раздарожжа.** *Алесь адчуў сябе старэйшым. Больш таго — адчуў, што страшны, халодны* ***час раздарожжа*** *закончыўся, можна хоць штосьці рабіць, хоць за штосьці ўчапіцца.* (Я. Брыль)

**Шалі часу**. *На подзвіг, а не танныя заробкі Ішоў зямляк наш, кнігі кладучы На* ***шалі часу****, нібы самародкі, З пластоў глыбокіх вымытыя працай.* (А. Куляшоў)

**Шкло часу.** *Акопы вадой заліло, І сцішана сочаць нябёсы, Чые тут прагглянуцца лёсы Праз* ***часу*** *туманнае* ***шкло****?* (С. Гаўрусёў)

**Экспрэс гадоў.** *Ляціць у свет* ***Экспрэс гадоў*** *жывы.* (К. Кірэенка)

**Яблыні веку.** *Даспяваюць плады На адпушчанай кожнаму* ***яблыні веку****.* (М. Маляўка)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ